УДК 398(=161.3):[179.8+133.4] DOI 10.63874/2218-029X-2025-1-74-81

***Вольга Іванаўна Трубач***
*магістр мастацтвазнаўства, аспірант 3-го года навучання*
*аддзела фалькларыстыкі і культуры славянскіх народаў*
*Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры*
*Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі*
***Volha Trubach***
*Master of Arts, Postgraduate student in the Department of Folklore and Culture of Slavic Peoples*
*of the Center for Research on Belarusian Culture, Language and Literature*
*of National Academy of Sciences of Belarus*
e-mail: trubach-28@mail.ru

# ЗАЙЗДРАСЦЬ І «ЗАЙЗДРАШЧЫ» Ў ТРАДЫЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСАЎ

*Даследуецца зайздрасць як эмоцыя (эмацыянальны стан, пачуццё) чалавека і як мадэль сацыяльных паводзін у кантэксце традыцыйнага грамадства. Апісана народнае бачанне зайздрасці ў рэчышчы асобнага віду сурокаў – «зайздрашчы». Разгледжаны сітуацыі, у якіх найбольш часта ўзнікае зайздрасць, а таксама стратэгіі абароны ад зайздрасці. Абазначаны стратэгіі абыходжання з зайздрасцю ў вясковай супольнасці: рэфлексія або рэсантымент. Выяўлены дзеянні, якія дапамагаюць нейтралізаваць зайздрасць у выпадку, калі яе суб'ект не хоча аказаць шкоднага ўплыву на іншага. Апісаны ўплыў эмоцыі на суб'екта зайздрасці пры яго жыцці і пасля смерці. Абазначана лакалізацыя зайздрасці ў целе чалавека. Разгледжаны сітуацыі асэнсавання зайздрасці як пажаданай эмоцыі з боку сацыяльнага асяроддзя.*

***Ключавыя словы:*** *зайздрасць, сурокі, «зайздрашчы», «ліхое вока», рэфлексія, эмоцыя, рэсентымент, агрэсія.*

## *Envy and Evil Eye in the Traditional Culture of Belarusians*

*The article considers envy as a human emotion and as a model of social behavior in the context of traditional society. The folk idea of envy is described through a special kind of evil eye. Strategies for dealing with envy in a rural community are outlined: reflexion or ressynthesis. Actions helping to neutralize envy in cases when its subject does not want to exert harmful influence on another are revealed. The situations in which envy most often arises are considered, as well as strategies of defense against envy. The influence of the emotion on the subject of envy during life and after death is described. The localization of envy in the human body is outlined. Situations of understanding envy as a desirable emotion on the part of social environment are considered.*

***Key words:*** *envy, evil eye, jealous, reflection, emotion, ressentiment, aggression.*

### Уводзіны

На аснове белararусіх фальклорных тэкстаў канца XIX – XX ст. у артыкуле разгледжана эмоцыя зайздрасці. Прама або ўскосна тэмай зайздрасці займаліся G. Foster, Г. Шэк, Т. Касумаў, А. Байбурын, С. Адоньева і іншыя даследчыкі. Мэта артыкула – разгледзець эмоцыю зайздрасці ў комплексе традыцыйнага светапогляду беларусаў на прыкладзе фальклорных тэкстаў. У сувязі з гэтым былі пастаўлены наступныя задачы: вывучыць прычыны з'яўлення зайздрасці, шляхі яе пераходу ў агрэсію, асобны від сурокаў, звязаны з разглядаемай эмоцыяй, стратэгіі абыходжання з зайздрасцю, дзеянні па нейтралізацыі эмоцыі, а таксама вызначэнне сітуацый, калі зайздрасць выступае ў якасці пажаданай эмоцыі.

Дадаткова ўвага была адведзена апісанню народных уяўленняў пра лакалізацыю зайздрасці ў целе чалавека, уплыў эмоцыі на чалавека пасля яго смерці.

### Асноўная частка

Зайздрасць – агульначалавечая эмоцыя. Сацыяльны антраполаг Дж. Фостар назваў яе «першабытнай» [1, с. 166]. Зайздрасць мае відавочна разбуральны характар,

*Навуковы кіраўнік – Таццяна Васільеўна Валодзіна, доктар філалагічных навук, прафесар, загадчык аддзела фалькларыстыкі і культуры і славянскіх народаў Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі*

таму ў кожным грамадстве распрацоўваліся культурныя стратэгіі, накіраваныя на абарону ад яе і змяншэнне негатыўных наступстваў.

Праз прызму традыцыйнага светапогляду вясковая супольнасць разумеецца як сістэма, што падтрымлівае сацыяльны гамеастаз: імкненне да стабільнасці і ўзнаўляльнасці ўнутры лакальнага соцыуму. Адпаведна, адступленне ад нормы праяўляецца праз эканамічныя і сацыяльныя адрозненні: валоданне большай маёмасцю, наяўнасць прыгожай жонкі, добры ураджай, лад у сям'і і інш. Таму той, хто зайздросціць, «заўсёды знаходзіцца пад уплывам імкнення, часта несвядомага, зайздросціць усім, хто адхіляецца ад нормы» [2, с. 17]. Тэкст восеньскай песні расказвае пра зайздрасць да жанчыны, якая мае здольнасці да працы, а адпаведна мае больш дабротаў: *«Талака, талака // Талачылася, // Таўкучы, мелючы, // Я змарылася. // Сеяла мучыцу – // Апылілася. // Вышла на вуліцу – // Скаланулася // Ды сваім суседкам // Наругнулася. // Работка мая // Уся пыльная, // Маім суседзям // Ды й завідная»* [3, с. 372].

Дачка ўзгадвае пра сваіх бацькоў, якія вельмі добра ладзілі паміж сабой, што стала падставай для зайздрасці з боку аднавяскоўцаў: *«Они всегда вместе: надо за травой, надо косить – они идут вместе. Они какие-то колхозные работы берут – значит, они вместе. С работы приходят и пошли вечером. Что-то по хозяйству делать – они всегда вместе. Почему у нас в деревни говорили: "Ой, Лёлька с Мишкой – это вот самая пара". Это на столько хорошая семья... И поэтому всегда завидовали нам. Зависть была у людей... Зависть у людей такая, что: "А у меня в семье плохо, а у них так хорошо"»* [4: 2025.002_Minsk., Зап. Трубач В. І. у 2025 г., Мінск, ад Надзеі Міхайлаўны Мурашкі, 1963 г. н.]. Істотна, што часцей за усё суб'ектамі зайздрасці выступаюць людзі, якія тэрытарыяльна знаходзяцца блізка да таго, каму зайздросцяць.

**Актуалізацыя зайздрасці праз агрэсію**

Доўгі час зайздрасць можа знаходзіцца ў латэнтным стане, аднак пры пэўных абставінах яна пераходзіць у актыўную форму. Такі запуск адбываецца ў выніку механізму рэсантыменту (фр. *ressentiment* – памяць пра злое, азлабленне, прага да помсты). Нямецкі філосаф і сацыёлаг М. Шэлер апісвае рэсантымент як «перажыванне зноў і зноў пэўнай эмацыянальнай рэакцыі ў адносінах да другога, у працэсе якога гэта эмоцыя паступова паглыбляецца ў цэнтр асобы» [5, с. 10]. *«Пакуль буду помніць, пакуль пароша вочы не заплюець»* [6, с. 91], *«Завіднаму чужая бяда, як цукар»* [7, с. 263], – падсумоўваюць беларускія прыказкі.

Рэсантымент – механізм пераводу энергіі зайздрасці ў актыўнае дзеянне. Менавіта злапамятнасць актуалізуе агрэсіўныя паводзіны суб'екта зайздрасці (напрыклад, магічную шкоду). У адрозненне ад рэфлексіі, якая яшчэ захавала магчымасці для ўтрымання зайздрасці ў межах «неагрэсіі», рэсантымент – гэта новае перажыванне мінулага адчування, дзякуючы якому яно ўзмацняецца, каб дзейнічаць агрэсіўна; у сваю чаргу, гэта запускае пераход ад перавагі жыццёвых маральных каштоўнасцей да ўстановак, што вядуць да разбурэння [8, с. 16, 7]. Перайшоўшы гэту мяжу, становіцца практычна немагчыма выкарыстоўваць энергію зайздрасці ў мэтах самаразвіцця. Разглядаючы рэсантымент у фальклорнай плоскасці, варта ўзгадаць словы беларускай прыпеўкі: *«Я сваю саперніцу // Атнясу на мельніцу. // Брошу в камень галавой, // Астанецца мілый мой»* [9]. Яна яскрава ілюструе ўздзеянне рэсантыменту на чалавека, якога перапаўняе зайздрасць. (Пра рэўнасць складана сцвярджаць, таму што статусы дзвюх дзяўчын у прыпеўцы не пазначаныя. Звычайна раўнуюць таго, з якім ёсць нейкія дамоўленасці ў выглядзе адносін або шлюбу).

Механізм рэсантыменту спрацоўвае і ў чарадзейных казках, калі сястра зайздросціць наяўнасці дзяцей у другой сястры. Эмоцыя выліваецца ў забойства пляменніка: *«А была пры ёй сястра на той час, так яна, завідуючы ёй, узяла палажыла голуба* (у люльку – *В. Т.*)*, а дзіця панясла ў кусты да й закапала»* (казка «Барабанчыкі-Панічыкі») [10, с. 323]. Фальклорныя прыклады паказваюць, як зайздрасць праз рэсантымент змяняе пасіўную форму зайздрасці на актыўную, разбуральную агрэсію.

**«Зайздрашчы»**

Негатыўны сцэнарый разгортвання эмоцыі зайздрасці запускае механізм, які ў народзе называецца «зайздрашчы»: *«Ва імя*

*Айца і Сына і Святога Духа, Матка Боска Жыровіцкая і ўсе святыя наша Мізгороўская. Грудкова, Вілейская цэркаві, станьце як удзень, так і ўночы. Зніміце хваробу з сініх ачэй, з сініх жыл, з белага цела, з чырвонае крові, зніміце ўдар, зніміце зайздрашчы і станьця ў помашчы. І ўсё, і Отча наш»* [4: 2019.003_Pruzany. Зап. Валодзінай Т. В. у 2019 г., в. Клепачы, Пружанскі р-н, ад Галіны Мікалаеўны Паляшук, 1936 г. н., Марыі Мікалаеўны Каско, 1933 г. н.]. Гэты механізм прадугледжвае пагаршэнне псіхалагічнага і фізічнага стану чалавека. «Зайздрашчы» з'яўляюцца адным з відаў сурокаў. Пры гэтым адрозніваюць наўмысныя і ненаўмысныя сурокі. Гэта адрозненне заснавана на фіксацыі зайздросніка на сваіх адмоўных эмоцыях адносна аб'екта зайздрасці. Істотна, што зайздросцяць людзям з бліжэйшага сацыяльнага асяроддзя, з якім чалавек падзяляе паўсядзённасць і мае стасункі. Прадметам зайздрасці можа станавіцца характарыстыка, якую зайздроснік усведамляе як каштоўнасць, але ён не валодае ёю або валодае ў недастатковай ступені.

Адрозненне ад нормы запускае механізм трансгрэсіі: іншымі словамі, чалавек, які нечым адрозніваецца, для завідлівага парушыў правілы сацыяльнага кансэнсусу, перайшоў межы дазволенага [11, с. 18]. Гэта, у сваю чаргу, патрабуе ўрэгулявання сітуацыі магічнымі сродкамі.

### «Ліхое» вока

У народных уяўленнях існуе меркаванне, што такія ўніверсальныя каштоўнасці, як здароўе, юнацтва, дзеці патрабуюць дадатковай абароны ад благога (*ліхога, злога, зайздроснага вока*). «Шырока распаўсюджаная вера ў негатыўную сілу *дурнога вока* грунтавалася на ўяўленнях аб чалавечым (звярыным) поглядзе як спецыфічнай форме матэрыяльнага кантакту» [12, с. 496]. «Нядобразычлівае ўздзеянне іншага чалавека, выражанае праз погляд, думкі, зайздрасць, ва ўяўленнях вяскоўцаў, прыводзіла да рэзкага пагаршэння стану і нават сур'ёзных захворванняў, у выніку чаго чалавек па традыцыі звяртаецца да замоўнай практыкі» [13, с. 590]. У Глыбоцкім раёне ўзгадваюць: *«Я гуляла свадзьбу сваёй дваюраднай сястры. І вот первы дзень, як яны вянчаліся ў Задарожжы ў касцелі, мне нічога. А на заўтра, ужо я надзелася і будзім ужо садзіцца за сталом. І мяне зразу злажыла. Толькі селі за стол, яшчэ і румкі ніхто не падняў, і мне плоха і плоха, і я збялела. Мяне вывялі із-за стала. Ну, бабуля мая ўмела ваду гаварыць. І я, мусіць, часы тры адлежыла. Яна мне давала, змывала і піць мне давала. І тады мне гэта ўсё прайшло. А каб не было бабулі, можа б мне і ўсё было. Можа б я і памёрла… ну, хто яго ведае ад чаго. Нехта паглядзеў, нешта падумаў. Можа вока нейкае ў чалавека»* [4: 2025.005_Hlybokaje. Зап. Трубач В. І. у 2025 г., Глыбоцкі р-н, ад Чаславы Герасімаўны Браткевіч, 1941 г. н. (в. Шчаўкуны) і Францішкі Францаўны Гарнастай 1940, г. н. (в. Багушэвічы)].

*«Няма горай, як завісныя вочы»*, *«Завіснае (паганае) вока нічым не наталіш»*, *«Завіднае вока бачыць далёка»*, – сцвярджаюць беларускія прыказкі [7, с. 263]. Самымі папулярнымі лекавымі замовамі з'яўляюцца замовы супраць «ліхога вока» ад сурокаў. Яны адлюстроўваюць саматычную лакалізацыю зайздрасці ў целе чалавека – вочы: *«Святы апостал-храніцель, сахрані раба божага ад напасьніка, ад навушніка, ад чарадзейніка, ад паганых рачэй, ад завісных вачэй, каторыя на мяне нацекаюць і людзей з'ядаюць і вачмі, і гаворкамі, і мыслямі»* [14, с. 18]. Замовы канкрэтызуюць знешнія характарыстыкі зайздроснага вока, прынамсі колер: *«Угаварываю, выбіраю ўрокі, прыгаворы дзявоцкія, хлапоцкія, разных вачэй: вока чорнага, вока серага, вока карага, вока сіняга»* [14, с. 258].

У тэкстах замоў сустракаецца словазлучэнне «завісны і радасны»: «Ад галоснага і ад злоснага, ад завіснага і ад радаснага, ад вадзянага і сухавейнага… загаварую я ўроцы і прароцы, стрэшныя і папярэшныя, завісныя і радасныя, жаноцкія і дзявоцкія і дзяцюцкія» [14, с. 223, 227]. Верагодна, гэта звязана з тым, што сурочыць маглі не толькі праз негатыўную эмоцыю злосці або зайздрасці, але і ў выпадку фіксацыі на пэўных знешніх або ўнутраных характарыстыках аб'екта пільнай увагі: *«Чалавеку наўрок стаў, бывае так, што слова чалавек скажа, дажа ты красівая, і табе яно паўрадзіць. Ні пазавідаваць не нада, ні пасьмяяцца»* [4: Ф. 23. Воп. 11. Спр. 9. Зап. Валодзіна Т. у 2011 г., в. Андрэеўка Дабрушскі р-н ад Марыі Пятроўны Балмаковай, 1937 г. н.].

Ч. Пяткевіч у даследаванні Рэчыцкага Палесся апісвае ўрокі (прыстрэк з падзіву): *«Немаўля можна сурочыць не толькі па злому намеру, але і з падзіўлення яго здароўя, пекнаты, характару і інш., а таксама пахвалой, калі той, хто дзівіцца, не засцеражэ сябе ў гэты момант формулай: не ўрокам кажучы»* [15, с. 30].

Сітуацыі ацэнкі істотных для сябе з'яў і прадметаў, якія маюць дачыненне да іншага чалавека, часта звязана з патаемнай зайздрасцю. Т. Валодзіна сцвярджае, што «на поўдні Міншчыны старанна размяжоўваюць ненаўмысныя сурокі і свядомую псоту, называючы кожны від немачы асобным найменнем» [13, с. 590].

### Зайздрасць і рэфлексія

Звернем увагу на той факт, што беларускія фальклорныя тэксты, у прыватнасці сямейна-бытавыя песні, апісваюць не толькі перажыванні страху перад зайздрасцю, а наадварот, імкненне вызваць яе: *«Каціліся журавінка к татку ў госці, мая рыбінка. // Ні піць, есці мне не хочацца, // З родным таткам пасядзець хочацца. // Сядзім, сядзім мы, бяседуем – // Хай нам людзі пазавідуюць, // Што мы з родных харашэнька жывём. // Як сойдземся – павітаемся, // Расходзімся – папрашчаемся, // Пра здаровейка папытаемся»* [16, с. 315]. Людзі зайздросцяць маладой сям'і, у якой бытуе лад, пазітыўныя зносіны паміж бацькам і дачкой, якая нядаўна стала маладой жонкай. Зайздрасць з боку чужых людзей становіцца жаданай, калі яна разглядаецца як маркер добрага жыцця, да якога імкнуцца іншыя члены вясковай супольнасці. Т. Касумаў слушна зазначае: «Атрымоўваецца, зайздрасць і поспех звязаныя паміж сабой… а ўсё таму, што сапраўднаму поспеху патрэбна ў тым ліку і малая частка зайздрасці, без яе і поспех не поспех» [8, с. 20].

Выслоўі і прыказкі падмацоўваюць існаванне ў народзе імкнення адчуваць у адносінах да сябе зайздрасць. Наступныя зычэнні канкрэтызуюць дадзенае жаданне: *«Дай, божа, каб людзі завідавалі»* [17, с. 183], *«Людзям на завісць, а нам на карысць»* [17, с. 163], *«Віншуем на гладкасць, на буйнасць, // Паненкам на зайздрасць»* [18, с. 371]. Звернем увагу, што апошняе велікоднае віншаванне ўказвае на гендарны аспект зайздрасці, называючы ў ролі суб'ектаў разглядаемай эмоцыі жанчын.

Такім чынам, падобныя прыклады сведчаць аб пераходзе ў мысленні чалавека традыцыі: ад дамінанты адпавядання норме да прызнання перавагі асабістага поспеху ў рамках лакальнага соцыуму. У сваю чаргу, апошняе дазваляе заваяваць уладу ў супольнасці, паколькі зайздрасць з'яўляецца адным з важных элементаў у гэтым працэсе.

Калі суб'ект зайздрасці звяртаецца да трэцяй асобы (знахара), то ён не вырашае праблемы самастойна і тым самым значна мінімізуе зварот да ўласнай рэфлексіі (лац. *reflexio* – зварот назад). У такім выпадку чалавек традыцыйнага ладу жыцця прыбягае да магіі. Калі чалавек спрабуе рэфлексаваць, ён перамагае зайздрасць у самім сабе, выкарыстоўваючы, напрыклад, рэлігійныя перакананні: *«Штобы Рай заслужыць, нада быць очэнь чэсным, очэнь справедлівым, ні завідаваць нікому. Но эта ж чалавек – дажа есьлі шчытаць бацюшкаў, ксянзоў, і то яны не заслужаць, пэўна, ня тока што мы, грэшныя»*, – расказваюць на Мядзельшчыне [13, с. 569]. *«Дзетка, не завідуй ні на кога, Бог будзець адной крошачкай пітаці»* [4: Ф. 8. Воп. 89. Спр. 124. Зап. Валодзінай Т. В., Боганевай А. М. у 2019 г., в. Лямніца, Бялыніцкі р-н, ад Феадосіі Нікіфараўны Нікіцінай, 1932 г. н.], *«У нашага Санькі харошая жонка, // Бог яму даў, не завіда́йця, братцы паноўя, дасьць Бог і вам! // Па двару ходзя, ключыкі нося, // Ключыкі нося, скрынь атмыкая, // Скрынь атмыкая, грошы вымая, // Скрынь атмыкая, людзей частуя»* [4: Ф. 20. Воп. 77. Спр. 36. Зап. Кабашнікаў К. П. і Крук І. І., в. Азяры́шча, Рагачоўскі р-н, ад Аляксандры Платонаўны Кавалёвай, 1907 г. н., Матруны Іванаўны Вяльковай, 1908 г. н., Насты Панцеляймонаўны Шутавай, 1910 г. н., Ганны Сямёнаўны Сазонавай, 1923 г. н.] або прыказкі: *«Завісць не пойдзе ў карысць»* [7, с. 264]. Маладая дзяўчына на выданні заахвочвае сваіх сяброўак не зайздросціць, бо хутка і яны пойдуць замуж, пакінуўшы родную сям'ю: *«І пахілілася каліна, // Пахілілася на Дунай // І лісцем беражкі пакрыла, // Карэннем ваду змуціла. // І пакарыстая Анютка // Пакарылася татульку. // І слёзкамі ножкі абліла, // Шоўкам касіцу апляла. // – Ах вы, дзевачкі, вы ўсе мае, // Не завіды-*

*вайце вы мне, // Бо і вы гэтага дажджэце, // Шоўкам касіцу спляцеце»* [3, с. 185].

Тым самым чалавек імкнецца рэдукаваць зайздрасць і дазволіць звычайнаму жыццю працягвацца з мінімальным узроўнем канфліктнасці. У ідэальным варыянце былы зайздроснік пачынае займацца асабістым жыццём, рэфлексаваць і накіроўваць сваю энергію на рэалістычныя і дасяжныя мэты [2, с. 20]. У сваю чаргу, гэта спрыяе зменам у асабістых паводзінах і жыцці чалавека.

**Абарона ад зайздрасці і яе ўплыў на суб'екта**

У выпадку калі чалавек выказваў захапленне іншым чалавекам або прадметам і ўсведамляў патэнцыйную небяспеку зайздрасці ў сваім выказванні, то ён дадаваў: *«Не ўрокам кажучы»* [4: Ф. 9. Воп. 2. Спр. 21. Сборник белорусских пословиц и поговорок (рукопись). Составитель: Сержпутовский А. К., с. 75].

Калі зайздрасць станавілася відавочнай, то аб'ект зайздрасці, той, каму зайздросцілі, выкарыстоўваў слоўныя формулы-абярэгі ад яе: *«Няхай табе крук вочы выесць»*, *«Соль табе ў вочы, маланья у зубы, громам па жывату, траскучае палена ў калена!»* [17, с. 231, 235].

Як бачна, ступень эмацыянальнасці моўных формул знаходзіцца ў дыяпазоне ад нейтральных выказванняў да адкрытай агрэсіі ў форме праклёнаў.

Асобнага разгляду патрабуе факт уздзеяння эмоцыі на суб'екта зайздрасці. У такой сітуацыі чалавек не скіроўвае яе вонкі, а пакідае ўнутры сябе. Гэта мае адмоўнае ўздзеянне на цела чалавека: запускаецца сцэнарый самаразбурэння. Так, у беларускай прымаўцы ідзе гаворка пра негатыўнае саматычнае ўздзеянне на арганізм чалавека, які зайздросціць: *«Завідкі з сярэдзіны чалавека з'ядаюць»* [7, с. 264].

У сваю чаргу, перажыванне чалавекам зайздрасці можна разгледзець праз прызму архаічных перакананняў, згодна з якімі любое хваравітае адхіленне ад нормы ўвасабляецца ў пэўных хтанічных арганізмах. У народнамедыцынскім комплексе Т. Валодзіна выяўляе вераванні ў наяўнасць асобнай існасці, што жыве ў целе і пры пэўных разбуральных перажываннях і хваробах актывізуецца і ўздзейнічае на паводзіны чалавека. Такія вераванні абапіраюцца на назіранні за рэальнымі паразітамі, якія жывуць у целе чалавека, і на ўяўленні пра дэманічных істот, што выклікаюць хваробы. Ва ўяўленнях беларусаў зламысныя намеры чараўніц ўвасабляліся ва ўнутраным хваробатворным чарвяку [19, с. 191].

Такім чынам, праз прызму міфалагем магчыма заўважыць саматычнае ўвасабленне зайздрасці ў арганізме чалавека, якое характарызуецца працяглай хваробай.

Знаходжанне чалавека ў лімінальных станах звязвалася з пільнай увагай з боку соцыуму. Нараджэнне дзіцяці, шлюб маглі правакаваць зайздрасць з боку аднавяскоўцаў. Маладыя на вяселлі практычна ўвесь час знаходзяцца навідавоку. Не заўсёды такая ўвага суправаджаецца станоўчымі эмоцыямі. «Паўсюдна лічыцца, што ў гэта бесчасоўе жаніх і нявеста найбольш уразлівыя (неабароненыя). Існаванне такіх уяўленняў цалкам натуральна, паколькі маладыя пазбаўлены ўсіх тых атрыбутаў нармальнага чалавека, якія забяспечваюць яго сацыяльную абароненасць» [20, с. 66, 76].

Радзільная абраднасць уключае ў сябе комплекс народных вераванняў, якія прадугледжваюць пэўны рэгламент у дзеяннях цяжарнай жанчыны, каб пазбегнуць нараджэння зайздроснага дзіцяці. У вёсцы Моталь Іванаўскага раёна цяжарнай забаранялася есці на хаду: *«Нельга тоўстай ідучы есці, бо дзіця будзе завідным»* [21, с. 60]. У Старадарожскім раёне апісваюць сувязь зайздрасці ў дзіцяці з неабачлівымі дзеяннямі маці: *«Не павідуй (*не пазавідуй. *– В. Т.), што бачыш, нічаво не хаці, а то дзіця такое жаднае будзе»* [21, с. 166]. Аб тым жа паведамляе інфармантка з Бялыніцкага раёна: *«Ці чалавек есь, а бярэменная глядзіць і жаднічае, завідавае, эта нельзя, пражорлівы будзя дзіцёнак»* [4: 2019.009_Bialynicy. Зап. Валодзінай Т. В. у 2019 г., в. Лубяны Бялыніцкі р-н, ад Валянціны Ягораўны Платонавай, 1950 г. н., Ніны Яўгенаўны Аршаўскай, 1945 г. н.]. Гэта яшчэ раз падкрэслівае перадачу паводзін маці дзіцем.

**Смерць і зайздрасць: пячатка зайздрасці**

Хоць у прыказцы і сцвярджаецца, што *«Пакуль вочы не засыплюць пяском, датуль завістліў чалавек»* [7, с. 264], паводле народных уяўленняў, зайздрасць не пера-

пынялася са смерцю. Падчас пахавання зайздроснага чалавека маглі ўзнікаць пэўныя цяжкасці. Паказальна, што пасля пахавання з магілай зайздроснага чалавека здараюцца пэўныя метамарфозы: *«У зайздросніка магільны насып абвальваецца ніжэй за бакі, прычым у розных месцах відаць вялікія і маленькія норкі. Каб спыніць зайздросніка, трэба насыпаць у кожную норку трошкі маку. Натрапіўшы каля выхаду на мак, ён зоймецца зборам зярнятаў і забудзецца на людзей»* [22, с. 291].

Верагодна, у традыцыйных уяўленнях беларусаў зайздросны чалавек меў асаблівую маркіраванасць у вясковым асяроддзі. Пачуццё зайздрасці, якое перажываў чалавек, станавілася асноўнай характарыстыкай такой асобы. На ўзроўні псіхалагічнай парадыгмы гэта тлумачыцца ўкараненнем зайздрасці як часткі *ego*. «У гэтым выпадку зайздрасць становіцца агульнай рэакцыяй індывіда на сваё асяроддзе» [8, с. 11].

**Заключэнне**

Упершыню ў беларускай фалькларыстыцы асобнае даследаванне прысвечана перажыванню зайздрасці. Зайздрасць – эмоцыя (эмацыянальны стан, пачуццё), харак- для любога грамадства. Чалавек традыцыйнага светапогляду мог па-рознаму спраўляцца з ёй. Спрабаваць яе кантраляваць, абапіраючыся на ўласную рэфлексію, і тады зайздрасць арганічна сумяшчалася з пачуццём радасці, гонару за другога, выступала ў якасці стымулу для ўласнага змянення. Або перажываць рэсантымент і станавіцца ў залежнасць ад эмоцыі: зайздроснік пачынаў увасабляць яе ў шкодных словах, дзеяннях, тым самым праяўляць агрэсію. У беларускай традыцыі гэта адпавядае паняццю «зайздрашчы» – адзін з відаў сурокаў, здзейсненых пад уплывам зайздроснага. У сітуацыі, калі зайздрасць не мела ніякай праявы і заставалася ўнутры чалавека, гэта правакавала дэструктыўныя наступствы ў яго арганізме. Месцам лакалізацыі зайздрасці ў целе чалавека беларуская традыцыя абірае вочы з адпаведнымі эпітэтамі (ліхія, благія, злыя). Знаходжанне чалавека ў лімінальных станах (нараджэнне, вяселле) у патэнцыі можа выклікаць зайздрасць, што прадугледжвае выкананне пэўных канвенцый з мэтай абароны ад яе. Лічылася, што слоўныя формулы-абярэгі могуць выканаць гэту функцыю. У беларускай вясковай супольнасці ідэнтыфікацыя чалавека як зайздроснага пераўтваралася ў асноўнае найменне яго асобы. Нават пасля смерці члены супольнасці згадвалі чалавека менавіта праз прызму гэтай эмоцыі. У той жа час у беларускім традыцыйным светабачанні былі выяўлены сітуацыі, калі зайздрасць ставілася пажаданай эмоцыяй і, адпаведна, для таго, каму зайздросцілі, яна выступала ў якасці маркера паспяховага жыцця, а таксама спрыяла заваяванню аўтарытэта ў вясковай супольнасці.

СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ


1. Foster, G. M. The Anatomy of Envy: A Study in Symbolic Behavior / G. M. Foster // Current Anthropology. – 1972. – Vol. 13, nr 2. – P. 165–202.
2. Шэк, Г. Зависть: теория социального поведения / Г. Шэк. – М. : ИРИСЭН, 2008. – 544 с.
3. Восеньскія і талочныя песні / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы ; склад., сістэм. тэкстаў, уступ. арт. і камент. А. С. Ліс ; уклад. і камент. талоч. песень С. Т. Асташэвіч ; муз. частка В. І. Ялатаў ; рэд. А. С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1981. – 679 с.
4. Архіў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.
5. Шелер, М. Рессентимент в структуре моралей / М. Шелер. – СПб. : Наука : Университет. кн., 1999. – 231 с.
6. Прыказкі і прымаўкі : у 2 кн. / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы ; склад., сістэм. тэкстаў, уступ. арт. і камент. М. Я. Грынблат ; рэд. А. С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1976. – Кн. 1. – 560 с.
7. Прыказкі і прымаўкі : у 2 кн. / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы ; склад., сістэм. тэкстаў, уступ. арт. і камент. М. Я. Грынблат ; рэд. А. С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1976. – Кн. 2. – 616 с.

8. Касумов, Т. К. Зависть на пути к агресси / Т. К. Касумов // Вестник МГОУ. Серия «Общественно-политические и гуманитарные науки». – 2012. – № 3 (9). – С. 5–22.

9. Беларускі фальклор. Пазаабрадавая паэзія: прыпеўкі // Электронная бібліятэка БДУ, Эталонны фалькларыстычны мультымедыйны банк. – URL: https://elib.bsu.by/handle/-123456789/137582 (дата звароту: 21.02.2025).

10. Чарадзейныя казкі : у 2 ч. / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы ; склад. К. П. Кабашнікаў, Г. А. Барташэвіч ; рэд. тома В. К. Бандарчык. – 2-е выд., выпр. і дапрац. – Мінск : Беларус. навука, 2003. – Ч. 2. – 691 с.

11. Олсон, Л. Миры русской деревенской женщины: традиция, трансгрессия, компромисс / Л. Олсон, С. Адоньева. – М. : НЛО, 2016. – 440 с.

12. Лобач, У. Сурокі / У. Лобач // Беларуская міфалогія : энцыкл. слоўн. / С. Санько, Т. Валодзіна, У. Васілевіч [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 2004. – 592 с.

13. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / В. І. Басько [і інш.] ; ідэя і агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. – Мінск : Выш. шк., 2010. – Т. 5 : Цэнтральная Беларусь : у 2 кн. – Кн. 1. – 847 с.

14. Замовы / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы ; уклад., сістэм. тэкстаў, уступ. арт. і камент. Г. А. Барташэвіч ; рэдкал.: А. С. Фядосік [і інш.]. – 2-е выд. – Мінск : Беларус. навука, 2000. – 597 с.

15. Пяткевіч, Ч. Рэчыцкае Палессе / Ч. Пяткевіч ; уклад., прадм. У. Васілевіча ; пер. з пол. Л. Салавей, У. Васілевіча. – Мінск : Беларус. кнігазбор, 2004. – 672 с.

16. Сямейна-бытавыя песні / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы ; склад. І. К. Цішчанка ; склад. муз. часткі Г. В. Таўлай ; рэд. тома А. С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1984. – 752 с.

17. Выслоўі / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы ; склад., сістэм. тэкстаў, уступ. арт. і камент. М. Я. Грынблата ; рэд. тома А. С. Фядосік. – Мінск : Навука і тэхніка, 1979. – 520 с.

18. Валачобныя песні / НАН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя Кандрата Крапівы ; склад. Г. А. Барташэвіч, Л. М. Салавей ; склад. муз. часткі В. І. Ялатаў ; рэд. тома К. П. Кабашнікаў. – Мінск : Навука і тэхніка, 1980. – 560 с.

19. Валодзіна, Т. Цела чалавека: слова, міф, рытуал / Т. Валодзіна. – Мінск : Тэхналогія, 2009. – 431 с.

20. Байбурин, А. К. Ритуал в традиционной культуре. Структурно-семантический анализ восточнославянских обрядов / А. К. Байбурин. – СПб. : Наука, 1993. – 240 с.

21. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / В. І. Басько [і інш.] ; ідэя і агул. рэдагаванне Т. Б. Варфаламеевай. – Т. 4 : Брэсцкае Палессе : у 2 кн. – Мінск : Выш. шк., 2008. – Кн. 1. – 559 с.

22. Никифоровский, Н. Я. Простонародные приметы и поверья, суеверные обряды и обычаи, легендарные сказания о лицах и местах / Н. Я. Никифоровксий. – Витебск : Губерн. тип., 1897. – 179 с.

## REFERENCES

1. Foster, G. M. The Anatomy of Envy: A Study in Symbolic Behavior / G. M. Foster // Current Anthropology. – 1972. – Vol. 13, nr 2. – P. 165–202.

2. Shek, G. Zavist’: tieorija social’nogo poviedienija / G. Shek. – M. : IRISEN. – 2008. – 544 s.

3. Vosien’skija i talochnyja piesni / NAN Bielarusi, In-t mastactvaznaustva, etnahrafii i fal’kloru imia Kandrata Krapivy ; sklad., sistem. tekstau, ustup. art. i kamient. A. S. Lis ; uklad. i kamient. taloch. piesien’ S. T. Astashevich ; muz. chastka V. I. Jalatau ; red. A. S. Fiadosik. – Minsk : Navuka i tekhnika, 1981. – 679 s.

4. Arkhiu Instytuta mastactvaznaustva, etnahrafii i fal’kloru Nacyjanal’naj akademii navuk Bielarusi.

5. Shelier, M. Riessentimient v strukturie moraliej / M. Shelier. – SPb. : Nauka, Univiersitiet. kn., 1999. – 231 s.

6. Prykazki i prymauki : u 2 kn. / NAN Bielarusi, In-t mastactvaznaustva, etnahrafii i fal’kloru

imia Kandrata Krapivy ; sklad., sistem. tekstau, ustup. art. i kamient. M. Ja. Hrynblat ; red. A. S. Fiadosik. – Minsk : Navuka i tekhnika, 1976. – Kn. 1. – 560 s.

7. Prykazki i prymauki : u 2 kn. / NAN Bielarusi, In-t mastactvaznaustva, etnahrafii i fal’kloru imia Kandrata Krapivy ; sklad., sistem. tekstau, ustup. art. i kamient. M. Ja. Hrynblat ; red. A. S. Fiadosik. – Minsk : Navuka i tekhnika, 1976. – Kn. 2. – 616 s.

8. Kasumov, T. K. Zavist’ na puti k agriessii / T. K. Kasumov // Viestnik MGOU. Serija «Obshchiestvienno-politichieskije i gumanitarnyje nauki». – 2012. – № 3 (9). – S. 5–22.

9. Bielaruski fal’klor. Pazaabradavaja paezija: prypieuki // Eliektronnaja biblijateka BDU, Etalonny fal’klarystychny mul’tymiedyjny bank. – URL: https://elib.bsu.by/handle/123456789/137582 (data zvarotu: 21.02.2025).

10. Charadziejnyja kazki : u 2 ch. / NAN Bielarusi, In-t mastactvaznaustva, etnahrafii i fal’kloru imia Kandrata Krapivy ; sklad. K. P. Kabashnikau, H. A. Bartashevich ; red. toma V. K. Bandarchyk. – 2-je vyd., vypr. i daprac. – Minsk : Bielarus. navuka, 2003. – Ch. 2. – 691 s.

11. Olson, L. Miry russkoj dierievienskoj zhenshchiny: tradicyja, transgriessija, kompromiss / L. Olson, S. Adon’jeva. – M. : NLO, 2016. – 440 s.

12. Lobach, U. Suroki / U. Lobach // Bielaruskaja mifalohija : encykl. sloun. / S. San’ko, T. Valodzina, U. Vasilievich [i insh.]. – Minsk : Bielarus’, 2004. – 592 s.

13. Tradycyjnaja mastackaja kul’tura bielarusau : u 6 t. / V. I. Bas’ko [i insh.] ; ideja i ahul. red. T. B. Varfalamiejevaj. – Minsk : Vysh. shk., 2010. – T. 5 : Central’naja Bielarus’ : u 2 kn. – Kn. 1. – 847 s.

14. Zamovy / NAN Bielarusi, In-t mastactvaznaustva, etnahrafii i fal’kloru imia Kandrata Krapivy ; uklad., sistem. tekstau, ustup. art. i kamient. H. A. Bartashevich ; redkal.: A. S. Fiadosik [i insh.]. – 2-je vyd. – Minsk : Bielarus. navuka, 2000. – 597 s.

15. Piatkievich, Ch. Rechyckaje Paliessie / Ch. Piatkievich ; uklad., pradm. U. Vasilievicha ; pier. z pol. L. Salaviej, U. Vasilievicha. – Minsk : Bielarus. knihazbor, 2004. – 672 s.

16. Siamiejna-bytavyja piesni / NAN Bielarusi, In-t mastactvaznaustva, etnahrafii i fal’kloru imia Kandrata Krapivy ; sklad. I. K. Cishchanka ; sklad. muz. chastki H. V. Taulaj ; red. toma A. S. Fiadosik. – Minsk : Navuka i tekhnika, 1984. – 752 s.

17. Vysloui / NAN Bielarusi, In-t mastactvaznaustva, etnahrafii i fal’kloru imia Kandrata Krapivy ; sklad., sistem. tekstau, ustup. art. i kamient. M. Ja. Hrynblata ; red. toma A. S. Fiadosik. – Minsk : Navuka i tekhnika, 1979. – 520 s.

18. Valachobnyja piesni / NAN Bielarusi, In-t mastactvaznaustva, etnahrafii i fal’kloru imia Kandrata Krapivy ; sklad. H. A. Bartashevich, L. M. Salaviej ; sklad. muz. chastki V. I. Jalatau ; red. toma K. P. Kabashnikau. – Minsk : Navuka i tekhnika, 1980. – 560 s.

19. Valodzina, T. Ciela chalavieka: slova, mif, rytual / T. Valodzina. – Minsk : Tekhnalohija, 2009. – 431 s.

20. Bajburin, A. K. Ritual v tradicionnoj kul’turie. Strukturno-siemantichieskij analiz vostochnoslavianskikh obriadov / A. K. Bajburin. – SPb. : Nauka, 1993. – 240 s.

21. Tradycyjnaja mastackaja kul’tura bielarusau : u 6 t. / V. I. Bas’ko [i insh.] ; ideja i ahul. redahavannie T. B. Varfalamiejevaj. – T. 4 : Bresckaje Paliessie : u 2 kn. – Minsk : Vysh. shk., 2008. – Kn. 1. – 559 s.

22. Nikiforovskij, N. Ya. Narodnyje primiety i povierja, sujeviernyje obriady i obychai, liegiendarnyje priedanija o licakh i miestakh / N. Ya. Nikiforovskij. – Vitiebsk : Gubiern. tip., 1897. – 179 s.

*Рукапіс паступіў у рэдакцыю 03.04.2025*